

## Паліна Станкевіч

# Ля леснічоўкі

Вось і сонейка, вось лета.
Я прыйшла ў госці да паэта.
Сустакай мяне, Альбуць,
Дарогі да цябе вядуць!

“Дзын-дзын- дзын,” – вітае мушка,
І цвіце ля хаты грушка.
“Жых-жых-жых,” – камар лятае,
Падарожных сустракае.

Панадворак, пунька, хата
“Выглядае зухавата”.
Там гумно, а там дарога
Помніць Косцікавы ногі…

Дзесьці тут быў бык Мікіта
І глядзеў на ўсіх сярдзіта.
А з хлява ды парасяты
Ах, як рохкаюць заўзята!

Лес тут грозны і шумлівы,
Нёман хуткі і руплівы.
Тут паэт наш гадаваўся,
У дарогу адпраўляўся.

І я да Коласа прыйша,
Яго спазнала і знайшла.
Ля леснічоўкі на здзіўленне
Мне падары крыху натхнення.

## Я вучаніца

Я люблю сваю школу, я вучаніца,
І я крочу, іду да ўсё новых адкрыццяў.
Я люблю светлы клас і ўсе калідоры,
Тут чуваць галасоў шматлікія хоры.

Я люблю сваю школу, я вучаніца,
Падарожжы здзяйсняю я ў сталіцу.
Я люблю стадыён і нашу сталоўку,
А яшчэ пavароў нашых школьных гатоўку.

Я люблю сваю школу, я вучаніца,
Калектывам сваім буду я ганарыцца.
Усё пад сілу, асілім усё у гэты час,
Дружба, падтрымка звязвае нас.

Я люблю сваю школу, я вучаніца,
Мне любая навука павінна скарыцца.
Свет пазнання гарыць у школьным акне,
Пашанцавала вучыцца ў Канвелішках мне.